МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
«БАРАНОВИЧСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ»

**Инженерный факультет**
**Факультет славянских и германских языков**
**Факультет экономики и права**

# СПЕЦИАЛИСТ XXI ВЕКА

## Материалы III Международной научно-практической конференции, посвящённой 10-летию со дня образования университета

**4—5 июня 2014 г.**
**г. Барановичи**
**Республика Беларусь**

**В 2 книгах**
**Книга 2**

Барановичи
РИО БарГУ
2014

Репозиторий БарГУ

УДК 001(063)
ББК 72я73
С71

Рекомендовано к печати редакционно-издательским советом учреждения образования
«Барановичский государственный университет»

Р е ц е н з е н т ы:

*Д. М. Иваницкий*, кандидат технических наук, доцент кафедры
«Машины и технология обработки металлов давлением» Белорусского национального
технического университета (Минск, Республика Беларусь);
*Л. Г. Крот*, кандидат филологических наук, доцент, доцент кафедры теории и практики
английской речи учреждения образования «Минский государственный
лингвистический университет» (Минск, Республика Беларусь);
*А. А. Пилютик*, кандидат экономических наук, заместитель директора по информационно-коммуникационным технологиям и административно-хозяйственной работе
Государственного научного учреждения «Институт экономики Национальной
академии наук Беларуси» (Минск, Республика Беларусь);

Р е д а к ц и о н н а я к о л л е г и я:

*А. В. Никишова* (гл. ред.), *А. К. Гавриленя, Е. В. Панчук, А. В. Прадун* (отв. ред.), *Е. И. Белая,
Е. В. Бертош, Н. А. Егорова, З. И. Корзун, О. Н. Людвикевич, О. И. Наранович, М. В. Нерода,
А. А. Савко, О. Н. Фенчук*

**С71** **Специалист XXI века** [Текст] : материалы III Междунар. науч.-практ. конф., посвящённой 10-летию со дня образования ун-та, 4—5 июня 2014 г., г. Барановичи, Респ. Беларусь / редкол.: А. В. Никишова (гл. ред.), А. К. Гавриленя, Е. В. Панчук, А. В. Прадун (отв. ред.) [и др.]. — Барановичи : РИО БарГУ, 2014. — 209, [3] с. — 155 экз.

ISBN 978-985-498-580-0
ISBN 978-985-498-582-4 (Книга 2)

Освещаются актуальные проблемы влияния мировой экономики на развитие инновационных тенденций, состояние и перспектива развития законодательства, филологические и лингвистические аспекты образования, современные производственные и информационные технологии.

Издание представляет интерес для широкого круга специалистов сферы образования, аспирантов, студентов.

**УДК 001(063)**
**ББК 72я73**

**ISBN 978-985-498-580-0**
**ISBN 978-985-498-582-4 (Книга 2)**

© Коллектив авторов, 2014
© БарГУ, 2014
© Сидоренко А. Ю., художественное оформление обложки, 2014

Репозиторий БарГУ

УДК 82–311. 2

***Т. М. Пучынская,*** кандыдат педагагічных навук
***Ж. В. Косціна***
Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы

# КАНЦЭПТ *ДОМ* У ТВОРЧАСЦІ ВІКТАРА КАЗЬКО

**Уводзіны.** Літаратурны вобраз заўсёды выяўляецца сродкамі мовы, таму даследчыкі літаратуры арыентаваны на шматаспектнае вывучэнне мастацкага слова. Канцэпт — асноўная адзінка культуры, якая прадстаўляе свет у свядомасці чалавека, ствараючы канцэптуальную сістэму, а знакі чалавечай мовы кадзіруюць у слове змест гэтай сістэмы. Канцэпт ахоплівае не толькі шэраг абагульненых істотных прыкмет таго ці іншага прадмета рэчаіснасці, але і пачуццёва-наглядныя вобразы, абстрактныя сутнасці, індывідуальныя, ментальныя ўяўленні аб ім [1, с. 43].

**Асноўная частка.** Згодна этымалогіі, слова *дом* утворана ад індаеўрапейскага кораня *dom*, які сустракаецца не толькі ў беларускай мове, але і ў іншых мовах: параўн. рус. *дом*, укр. *дім*, польск. *dom*, чэш. *dum*, серб.-харв. *дом*, балг. *домът*, ст.-слав. *домъ*, прасл. **domъ*. Роднасныя формы: ст.-інд. *damas* ʽдом’, авест. *dam-*, грэч. σπίτι, лац. *domus*. Звычайна звязваецца з грэч. *бецо* ʽбудую’, гоц. *timrjan* ʽбудаваць’ [2, с. 141]. Такім чынам, лексема *дом* у сваім базавым значэнні з’яўляецца нейтральнай і не нясе асаблівых канатацый, яна ў першую чаргу суадносіцца з самой будовай, таму што звязана з семай «будаваць». Лексема *дом* убірае ў сябе наступныя кампаненты значэнняў: будынак для жылля, размяшчэння ўстаноў і прадпрыемстваў; чыё-небудзь жылое памяшканне разам з гаспадаркай; як назва дзяржаўнай, грамадскай, культурнай установы, а таксама памяшкання, дзе яна знаходзіцца; дынастыя, род [3, с. 189].

*Дом* з’яўляецца адным з ключавых канцэптаў у беларускай нацыянальнай канцэптасферы. Ён не толькі служыць для абазначэння жылля чалавека, але і ўяўляе сабой сапраўдны комплекс традыцый. Нацыянальная спецыфіка канцэпта *дом* яскрава праяўляецца ў культуры, звычаях, міфалогіі і літаратуры беларусаў.

Традыцыйным беларускім домам з’яўляецца хата. Дом, хата, жытло чалавека ў народнай аксіялогіі беларусаў — сімвал найвялікшай каштоўнасці: «Свая хатка як родная матка».

Кожнае жытло ў традыцыйнай свядомасці надавала свету прасторавы сэнс, аддзяляла чалавека ад навакольнага свету. У доме як бы суіснавалі чалавек і Сусвет, унутранае і вонкавае, таму станавіліся магчымымі перакадзіроўкі паміж часткамі чалавечага цела, элементамі космасу і дэталямі дому. Сам Сусвет асэнсоўваецца на пэўным этапе як велізарны дом з належнымі яму атрыбутамі: небам-столлю, цэнтрам, які часцей уяўляўся ў выглядзе Сусветнага дрэва, падмуркам (яго каранямі) [4, с. 155].

У мастацкай літаратуры вобраз хаты з’явіўся ў XVIII стагоддзі ў час панавання барочнай традыцыі, якая ў сваім нізкім стылі дыктавала зварот да народных асноў жыцця. Вядомы грамадскі і палітычны дзеяч Іахім Храптовіч на беларускай мове напісаў верш «Всем многі век в новой хаці» ў сувязі з канкрэтнай падзеяй: уваходзінамі ў новую хату дзеда і бабулі маладога паэта. У віншаванні паэтызуецца дом, у якім сабраліся госці на ўваходзіны: «Палац гойны, в нім прыгожо, // Паўберано



Репозиторий БарГУ

всюды гожо, // Где пойдеш, напасеш очы, // Гледеў бысь аж до цёмнай ночы, // Пачавшы од світа. // В сені вхожу, поглядаю, // Где Паном чолом біці маю, // І вхожу в тые покое, // Где з гостмі Панове двое, // А з німі дружына» [4, с. 155].

Вобраз хаты, хаткі сустракаецца ў творах паэтаў XIX стагоддзя даволі часта, ён узыходзіць да сімвала радзімы, якая ў гэты складаны перыяд беларускай гісторыі не мела назвы, таму што найменне «Северо-Западный край» не выяўляла нацыянальнай адметнасці, нацыянальнага каларыту. Дзеячамі XIX стагоддзя, якія стаялі перад абліччам «полілінгвізму» новай беларускай літаратуры, была прапанавана, бадай, адзіна мэтазгодная ў тых умовах канцэпцыя вываду нацыянальнай культуры з іншамоўнасці і тутэйшасці. Яны адраджалі нацыянальную адметнасць праз мастацкую інтэрпрэтацыю архетыпавых вобразаў і рабілі стаўку на нацыянальны фальклор, дзе лексемы *дом*, *хата* сімвалізавалі заможнае, шчаслівае жыццё. У сярэдзіне XIX стагоддзя імя Уладзіслава Сыракомлі было вядома ва ўсіх кутках Беларусі, заходнюю частку якой называлі Літвою, а жыхароў — ліцвінамі. «Літоўскім лірнікам», «песняром Літвы» называлі У. Сыракомлю ў польскім, рускім і замежным друку пры яго жыцці і доўгі час пасля смерці. Шчасце паэт звязваў з сялянскім жыццём і ўяўляў у вобразе беларускай хаткі (верш «Што ўмею намаляваць»). Лірычны герой твора сцвярджае, што, калі ён бярэ ў рукі аловак, заўсёды ў яго атрымліваецца «беларуская хатка, ці касцельчык, ці двор і з буслянкаю бусел»: «Каб то хата была, я штрыхамі б выводзіў // Саламяную стрэшку, акенца малое... // А ўсярэдзіне — люд працавіты у згодзе — // Дзецюкі і дзяўчаты, дзядок з барадою. // Маладосць — у каханні, надзеі і ў думе, // Век пахілы, што згадак грабе папялішча, — // Людзі мары сардэчнай не страцілі ў тлуме, // Хоць праз шчыліны вецер аб нэндзы ім свішча» [5, с. 78]. Вобраз хаткі сустракаецца і ў вершах «Вінцэнту Каратынскаму пры выданні “Чым хата багата”», «Пра маю старую хатку», дзе дадзены канцэпт раскрываецца як спакой, утульнасць, адгароджанасць ад чужога свету. У сваім праграмным вершы «Пастрыжыны» Вінцэсь Каратынскі запрашае ў хату-«сялянскі хорам», які ўвасабляе свет паэзіі маладога вучня Уладзіслава Сыракомлі. Ідэйным стрыжнем творчасці Вінцэся Каратынскага з’яўляецца абавязковая нацыянальная і сацыяльная прэзентацыя лірычнага героя: «Ліцвін я — ах, людцы, вялікі мне сорам // За свой перад вамі дабытак: // Мой хлеб у сурвеце, хлеб цьмяны ратая, // Вясёлым вачам не прынада, // Убогая песня, ды сэрцу святая... Чым хата багата, тым рада» [6, с. 15]. Канцэпт хаты выступае як вобраз Беларусі ў творчасці Францішка Багушэвіча (верш «Мая хата»), у прадаўжальніка яго традыцыі — Янкі Купалы (паэтычныя творы «Мая хатка» і «Мой дом»).

У творчасці сучасных пісьменнікаў таксама асэнсоўваюцца асноўныя канцэпты, уласцівыя народнай ментальнасці. Адным з такіх канцэптаў у творчасці В. Казько з’яўляецца *дом*, які носіць традыцыйны пачатак. У рамане «Хроніка дзетдомаўскага саду» акцэнт зроблены на канцэпце *сад*, аднак *дом* таксама мае значны сэнс: складаная вобразна-сюжэтная аснова твора знітавана ў адзінае цэлае вобразам хаты — святога месца, дзе чалавек знаходзіць душэўны спакой і суцяшэнне.

У адпаведнасці з літаратурнай традыцыяй хата і сад належаць да адной мастацкай прасторы, сад працягвае культурную прастору хаты. Спрадвеку існуе вясковая сялянская хата, да яе вяртаюцца героі рамана з вайны, з далёкіх жыццёвых дарог, пакланяюцца ёй, мараць пра новы дом і шчаслівае жыццё ў ім. Герой-апавядальнік, былы дзетдомавец, праз шмат гадоў вяртаецца ў вёску і купляе хату, хоць жыве ў горадзе: «Нічога мне не трэба. Толькі аркуш паперы і ручка і дах над галавою. Мая хата. Мая хата, што свеціцца ў цемры. Туды, у зіхатлівую сонечную хату» [7, с. 271].

В. Казько ўзбагаціў змест канцэпта *хата* ў беларускай літаратуры новым значэннем. На аснове ўласнага жыццёвага вопыту ён апісаў дзіцячы дом, які для значнай часткі пасляваеннага пакалення дзяцей стаў роднай хатай. Пісьменнік падкрэслівае, што замест казармы для пагранічнікаў узнік дзетдом («мая хата, мой дзетдом»). Сюды праз гады вяртаецца герой-апавядальнік як да роднага матчынага дома, вырашае набыць уласную хату ў вёсцы, «каб уцякаць сюды ад гарадскога тлуму і мітусні. Пасаджу дрэвы, ускапаю агарод, насяку дроў і буду пісаць, пісаць, пісаць. Ніхто не перашкодзіць. Ніякіх табе пасяджэнняў, сходаў, выступленняў. Ні жонкі, ні сяброў. Воля, прастор, чыстае паветра, адзіны кісларод» [7, с. 272]. Набыццё галоўным героем рамана, былым дзетдомаўцам, уласнай вясковай хаты спалучае ў сабе індывідуальна-аўтарскія праявы рэцэпцыі. У дакументальным фільме «Знакі лёсу» В. Казько згадвае эпізод з уласнага жыцця, калі дзетдомаўцы выратавалі ад пажару вясковую хату. Пазней, праз гады, Віктар Апанасавіч набыў яе, хата стала гасцінным домам не толькі для сям’і В. Казько, дзяцей, унукаў, але і для яго сяброў, пісьменнікаў Н. Гілевіча, В. Быкава, А. Жука, М. Стральцова.

В. Казько ў інтэрв’ю згадвае, што многія дзетдомаўцы, пазбаўленыя ў дзяцінстве бацькоў, марылі пра тое, каб у дарослым жыцці набыць сваю, асобную хату, пасадзіць сад, стварыць уласныя сем’і. Мара галоўнага героя рамана збылася: вясковая хата заўсёды чакае свайго гаспадара, аднак памяць пра мінулае, а таксама складаныя рэаліі сённяшняга дня прымушаюць яго трывожыцца. Праз канцэпт *дом* выяўляецца сутнасць характару галоўнага героя рамана «Хроніка дзетдомаўскага саду», які перажывае душэўную няўтульнасць, назіраючы як «паміраюць» вясковыя хаты без гаспадара, больш дакладна, гінуць пры жывых гаспадарах-гараджанах: «Што за прыхамаці ў таго гарадскога люду купляць у вёсцы хаты, купляць не таму, каб жыць у іх, а на адзін толькі месяц. Месяц жыцця хаце, а далей — паміранне» [7, с. 272].



Репозиторий БарГУ

Канцэпт *дом* звязваецца В. Казько са значэннем ʻдынастыя, родʼ, вясковая хата ўключае ў сябе ўсю шматграннасць паняцця «радзіма». Хата — найвялікшая каштоўнасць, гэта сувязь з сям'ёй, продкамі, маці-зямлёй, радзімай. Без светлай вясковай хаты няма будучыні. Душэўная прыгнечанасць, трывога аўтара перадаецца і чытачу, калі хата, якая «…свеціцца. Разумееш, свеціцца, свеціцца, свеціцца…» [7, с. 271], становіцца змрочнай: «Хата стаіць учарнелая, цёмная. Занядбаная, старая хата. Нежыццю патыхае з кожнага кутка. Ахаладзела, згубіла голас і музыку падлога… Хата страціла сваю мову, страціла язык. Аглухла, аслепла, патухла» [7, с. 271].

Плач чалавека па разбураным доме, боль галоўнага героя за сваю радзіму, занядбаны, высечаны дзетдомаўскі сад, за спадчыну, памяць, якую трэба было зберагчы, гучыць ва ўспамінах, унутраных маналогах героя: «Усё было б прыгожа, калі б там, каля фундаментаў гэтых хат, не ляжалі ўпокат ссечаныя яблыні… Дзетдомаўскі наш сад. …Чаму ж развал і разруха пануюць над нашай хатай, разбураны, па цаглінцы раскіданы печы, што сагравалі нас, пабіты вясёлыя вокны, узадрана падлога, што спявала нам?.. Хто вінаваты ў гэтым?.. А я не здолеў абараніць, адстаяць сваю хату» [7, с. 11]. Адчуванне ўласнай віны дамінуе ў «плыні свядомасці» героя, які праходзіць выпрабаванне горадам і разумее, што духоўнае жыццё, цеплыня стасункаў, сапраўднае сяброўства, каханне, адчуванне роднай зямлі магчымы толькі ў вёсцы, у роднай хаце.

Боль аўтара за «ўчарнелую» хату перарастае ў глыбокую трывогу за беларускі народ і яго будучыню, заклапочанасць «апусцеласцю хаты» паўтараецца на шматлікіх старонках рамана ў розных варыяцых. Вось Мар'ян Знавец, настаўнік, былы дырэктар дзіцячага дома, «паважна і строга, як афіцэр-адстаўнік», штораніцы зачыняе за сабой дзверы хаты і бярэцца «за клямку дзвярэй у школе», зімою чысціць сцежкі, адмыкае дзверы і задуменна ходзіць па школьных калідорах, іншым часам хапатліва выбягае на вуліцу, каб набраць дроў і прапаліць грубку ў апусцелым будынку. «І знадворку, гледзячы на дымок, што ўецца над комінам школы, ніхто б не сказаў, што яна зачынена, пустая, ніхто ў ёй не вучыцца: усе сцежкі расчышчаны, парогі падмецены і снег на двары бялюткі — усё напружылася і застыла, чакаючы школьнага званка. Вось-вось ён дзынкне, і школа ажыве…» [7, с. 334]. Канцэпт *дом* у дадзеным выпадку мае значэнне ʻбудынак для размяшчэння дзяржаўнай, грамадскай, культурнай установыʼ, па ідэйна-мастацкай напоўненасці памяшканне грамадскага прызначэння, школа, але ўспрымаецца як цёплы бацькоўскі дом, дзе прайшло жыццё цэлага пакалення дзетдомаўцаў і дзе ён, Мар'ян Знавец, з'яўляецца сапраўдным гаспадаром. Канцэпт і герой у згаданым эпізодзе выяўляюць наступную ўзаемасувязь: школа дзякуючы намаганням Мар'яна Знаўца стала душой усёй вёскі, цэнтрам жыцця для асірацелых дзяцей, праз гады гэтая сувязь паміж былым дырэктарам і школай моцна знітавана трывожнай памяццю аб пакаленні дзяцей вайны.

Дом у В. Казько — складаны, шматузроўневы мастацкі аб'ект, які паказаны ў дзвюх прасторавых мадэлях: вясковай і гарадской. Пісьменнік зыходзіць з апазіцыі «горад—вёска». Па сваім паходжанні героі В. Казько часцей за ўсё вяскоўцы або гараджане ў першым пакаленні. Нарадзіўшыся ў вёсцы і знешне прызвычаіўшыся да гарадской рэчаіснасці, яны душой знітаваны з вясковай хатай, роднай зямлёй. У рамане «Хроніка дзетдомаўскага саду» гарадская кватэра, «хрушчоба», апісаная ў паралельнай сюжэтнай лініі, пазбаўляе чалавека сапраўднага жыцця, дзе ёсць воля, прастор. Асацыяцыя з сінім колерам, што адпавядае настрою героя, які жыве ў аднапакаёвай кватэры, падкрэслівае адчужанасць, «закінутасць» чалавека ў межах горада і сучаснага хаатычнага свету: «Хрушчоба — вось гэта сапраўднасць… Клубы сіняга дыму ўздымаюцца да столі — гэта маё дыханне. Сінія твары мужчын і жанчын. Гэта сёння колер майго настрою, колер маёй душы. Мне шкада яе. Я плачу над ёй наўзрыд» [7, с. 270]. Менавіта гарадская кватэра, як прастора дысгарманічная, падкрэслівае ўнутраны душэўны разлад героя. Тут, у аднапакаёвай кватэры, хрушчобе, няма ні часу, ні прасторы («я не дыхаю, пазбаўлены часу і прасторы, адчужаны ад рэальнасці»), тут «…адны толькі паралітыкі. Я таксама паралітык» [7, с. 271].

Аповесць В. Казько «Прахожы» адметная перавагай суб'ектыўнага пачатку над аб'ектыўным, знешняй няўстойлівасцю сюжэта. У адрозненне ад ранейшых твораў пісьменніка («Неруш», «Хроніка дзетдомаўскага саду», «Выратуй і памілуй нас, чорны бусел» і інш.), гэтая аповесць вызначаецца яшчэ большай абагульненасцю і ўмоўнасцю мастацкай ідэі. Семантычнае ядро аповесці «Прахожы» грунтуецца на лірычных разважаннях Прахожага — абстрагаванага героя, «староннягa назіральніка на вечным балі жыцця». У свядомасці героя аповесці канцэпт *дом* існуе на эмацыянальным узроўні, у выглядзе арганізацыі паслядоўнасці думак, жаданняў, пачуццяў, звязаных менавіта з «зямнымі», чалавечымі перажываннямі. Вясковая хата з'яўляецца прытулкам для Прахожага, які вандруе па Сусвеце, яна выразна існуе ў яго свядомасці, хоць месца дзеяння даволі абстрагаванае, яно адбываецца па-за часам і прасторай: на зямлі і на камеце.

Душа галоўнага героя дваіцца: з аднаго боку, чалавек-стваральнік, адказны за лёс чалавецтва, хоча выратаваць зямлю, у яго абуджаецца гістарычная памяць, з другога — гэта «ненажэрная» істота, здольная забрудзіць увесь Сусвет. Аповесць прасякнута адчуваннем канца свету. Зорка Палын ужо прынесла шмат няшчасцяў, але гэта прадвесце яшчэ большай бяды: «Ідзе камета на зямлю. Пакаранне зямлі нябеснай карай» [8, с. 84]. Прахожы пакутліва шукае спосаб, які б дазволіў спыніць камету, абхітрыць таго, хто ёй



Репозиторий БарГУ

кіруе, і гэта не звышнатуральная сіла, а чалавек. Прахожы пазнае сябе ў ім. Сэнс алегорыі наступны: чалавек сваімі дзеяннямі, якія вынікаюць з бездухоўнасці, губіць зямлю, сам стварае канец свету. Таму невыпадкова ў канцы аповесці перад чытачом разгортваецца карціна апакаліпсісу — творча перапрацаваны біблейскі сюжэт, увасоблены ў метафарычна-сімвалічнай моватворчасці пісьменніка.

У самы змрочны і цьмяны, перадапакаліпсічны час Прахожы вырашае будаваць хату, хоць асаблівай практычнай неабходнасці ў гэтым не было: «Прытулак я меў, дах над галавой і цёплую печ. Але ж нешта ці нехта прымусіў мяне будавацца зноў» [8, с. 73]. Хата, якую будуе Прахожы, успрымаецца сімвалічна — як спроба выратаваць чалавецтва ў «цьмяны і жахлівы час»: «Недарэмна мудрыя людзі кажуць: у цьмяны і няпэўны час лепшае, што трэба і належна рабіць, — гэта будавацца» [8, с. 73]. У святле мастацкай ідэі твора хата асацыюецца з Ноевым каўчэгам, што павінен выратаваць чалавецтва ад глабальнай катастрофы. У фінале твора хата, пабудаваная Прахожым, гарыць, але гэты агонь — ачышчальны. Усё дрэннае згарэла, а зямлю «нехта асвячаў і мілаваў… на доўгі і шчаслівы шлях у свеце» [8, с. 73].

**Заключэнне.** Канцэпт *дом* з’яўляецца адным з ключавых у беларускай нацыянальнай літаратуры. Замацаваўшыся ў айчынным прыгожым пісьменстве XIX стагоддзя, дзе служыў абазначэннем жылля чалавека і ўяўляў сабой сімвал радзімы, шчасця, цяпла, утульнасці, творчасці, канцэпт *дом* працягваў дамінаваць у літаратуры XX стагоддзя. *Дом* атрыбутаваны В. Казько як нацыянальная каштоўнасць, што ўказвае на прадаўжэнне беларускай літаратурнай традыцыі.

## Спіс цытуемых крыніц

1. *Степанов, Ю. С.* Константы. Словарь русской культуры / Ю. С. Степанов. — М. : Наука, 1997. — 838 с.
2. Этымалагічны слоўнік беларускай мовы : у 11 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа ; уклад. В. Авілава [і інш.] ; рэд. Г. Цыхун. — Мн. : Беларус. навука, 2006. — Т. 11. Р—С. — 333 с.
3. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / рэд. А. Я. Баханькоў. — Мн. : БелЭн, 1978. — Т. 2. Г—К. — 768 с.
4. Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. — Мн. : Беларусь, 2011. — 607 с.
5. *Сыракомля, У.* Выбраныя творы / У. Сыракомля. — Мн. : Маст. літ., 2011. — 584 с.
6. *Каратынскі, В.* Творы / В. Каратынскі. — Мн. : Маст. літ., 2007. — 309 с.
7. *Казько, В.* Хроніка дзетдомаўскага саду / В. Казько. — Мн. : Маст. літ., 1987. — 430 с.
8. *Казько, В.* Прахожы / В. Казько // Полымя. — 1995. — № 9. — С. 24—104.

Материал поступил в редакцию 01.03.2014 г.

Репозиторий БарГУ